гІчным станам, нарэшце, асабІстым тэмпераментам.

Спецыфіка творчага самавыяулення у жанрах грамадзянска-патрыятычнай лІрыкІ, на наш погляд, амаль не даследавана. У той жа час вІдавочна яе надзённасць І актуальнасць у наш час – без гэтага немагчыма раскрыць фенамен раптоунага павароту нашай традыцыйна гуманнай І мІралюбІвай паэзІІ да праблем выключна жорсткІх І трагІчных, не уласцІвых нашай нацыянальнай лІтаратуры, цесна звязанай з выключнай дабрынёю І гуманнасцю характару беларуса, сфармаванага стагодзямІ змагання І пакут.

А.Ф.Майсеенка
(кафедра лІтаратуры)

## ДУХОУНЫ ВОБЛІК ГЕРОЯ

Лепшыя творы беларускІх празаІкау 70-х гадоу аб ВялІкай Айчыннай вайне набылІ сусветны рэзананс, знайшлІ І знаходзяць дарогу да чытача у самых розных кутках планеты. У тыя гады узрастала увага лІтаратуры да вытокау паводзІн чалавека на вайне, да выяулення глыбІнных рыс характару героя, яго духоунага аблІчча.

Сучасная лІтаратурная крытыка справядлІва адзначае, што паглыбленне гІстарызму у такІх выпадках суправаджалася узмацненнем псІхалагІзму І аналІтызму у адлюстраваннІ унутраных перажыванняу героя. Гэты працэс ахоплІвау творчасць шмат якІх савецкІх пІсьменнІкау, але асаблІва выразна І плённа ён выявІуся у прозе В.Быкава.

Не былІ выключэннем у гэтым сэнсе аповесцІ "СотнІкау" І "АбелІск", у якІх В.Быкау звярнууся да падзей партызанскай вайны у тыле ворага, асвятлІу Іх духоуным, эмацыянальным вопытам свайго часу. Гэтыя творы з'явІлІся у друку у пачатку 70-х гадоу І сталІ падзеяй у лІтаратурна-грамадскІм жыццІ, выклІкалІ гарачыя спрэчкІ. Пры гэтым крытычныя водгукІ на гэтыя творы былІ далека не адназначнымІ. Побач са справядлІва высокай ацэнкай Іх значнасцІ (А.АдамовІч, В.Каваленка, Дз.Бугаеу, В.Буран, С.Андраюк І Інш.) гучала неаб'ектыунасць, прадузятасць, якую сення можна вытлумачыць хІба што тагачаснай грамадска-палІтычнай кан'юнктурай. Вось што пІсау, напрыклад, Б.Лявонтv. " К сожалению, у В.Быкова нет исторического, победного пафоса в ... ...чх.

О каком подвиге ... можно говорить, если этот человек

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

давно перестал жить, ибо жизнь для него, как он сам признает, не имеет никакой ценности... Таковы они, эти проявления "ремаркизма" в действии, в разрушительном действии на талант белорусского писателя"[1].

У рэчышчы тагачасных Iдэалагiчных догм гучау I голас В.НовIкава, якI (цI толькI ёе!) абвIнавачвау В.Быкава у "тэндэнцыйных адносIнах... да супярэчлIвых з'яу жыцця", у "прынIжэннI гераIзму савецкIх салдат"[2].

У гэтых I падобных да Iх выказваннях – прамая атака на вернасць жыццёвай праудзе, на гуманIзм, пад сцягам якога лепшыя пIсьменнIкI краIны, у тым лIку I В.Быкау, выступалI у сваIх творах за вызваленне асобы з-пад завалау сталIнIзму. Гэта было наступленне супраць гуманIзацыI грамадскай свядомасцI I лIтаратуры, супраць адраджэння "абстрактных", як тады лIчылася, такIх маральных катэгорый, як сумленне, дабрыня, самакаштоунасць чалавечай асобы.

Мастацкая канцэпцыя аповесцей "СотнIкау" I "АбелIск" раскрываецца у многIх крытычных I лIтаратуразнаучых працах. Аднак па сённяшнI дзень не сцIхаюць спрэчкI (В.Каваленка – Дз.Бугаёу) адносна разумення вобразау СотнIкава I Рыбака, а таму варта звярнуцца да разгляду духоунага напаунення гэтых лIтаратурных характарау.

Як I у сваIх папярэднIх творах, у аповесцях "СотнIкау" I "АбелIск" В.Быкау вялIкую увагу удзяляе пранIкненню у свет думак I пачуццяу персанажау, даследаванню Iх душы у непауторных драматычных сIтуацыях, калI чалавек застаецца адзIн на адзIн з вайной, кожную хвIлIну знаходзIцца на мяжы жыцця I смерцI.

Аповесць "СотнIкау" з першай старонкI захапляе нашу увагу, прымушае з вялIкIм хваляваннем I напружаннем сачыць за развIццём у ей падзеI, пIльна узIрацца у павароты нялёгкага лёсу героя. ПIсьменнIк малюе падзеI шматмерна, з вострымI калIзIямI, прымушаючы героя хутка прымаць рашэннI, дзейнIчаць у нечаканых сIтуацыях. Надзвычай важна тое, што яму у аповесцI удалося стварыць арыгIнальныя характары, напоунIць Iх глыбокIм зместам, адкрыць Iстотна важнае I новае у матывах паводзIн чалавека на вайне, даследаваць тую вырашальную каардынату у духоуным жыццI героя, якая у адным выпадку вядзе да высокароднага подзвIгу, у другIм – да подласцI I

---

I. Б.Леонов. Красота подвига. Знамя, 1971, № 3. – С.189.
2. В.Новиков. Художественная правда и диалектика творчества. – М., 1971. – С.334.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ганебнай здрады. Уважлiва узIраючыся у твары тых, хто у неверагодна цяжкIх умовах выстаяу I перамог, В.Быкау бескампрамIсны у асудженнI себялюбства, прыстасавальнIцтва I сацыяльнага эгаIзму.

Наша знаёмства з галоуным I дзейнымI асобамI твора – партызанамI СотнIкавым I Рыбаком адбываецца тады, калI яны выконваюць загад камандзIра: забяспечыць прадуктамI атрад, блакIраваны карнIкамI. Заданне у нейкай меры будзённае у партызанскIм жыццI, звычайнае у сэнсе цяжкасцI I небяспекI, хоць ускладняецца яно тым, што вакол ворагI, а сцюжа I люты мароз даймаюць Iх, асаблIва хворага, кепска апранутага СотнIкава. I СотнIкау I Рыбак – не раз правераныя агнём партызанскIх боек, маюць аднолькавы – I немалы, – вопыт барацьбы з ворагам, жывуць, здавалася б, адной нянавIсцю I любоую. Абодва яны равеснIкI-аднагодкI, у мIнулым байцы Савецкай АрмII, былI паранены у баI, трапIлI у акружэнне, а пасля зноу узялIся за зброю. Праўда, да гэтага камбат СотнIкау пабывау у нямецкIм палоне, адкуль яму цудам пашчасцIла вырвацца, а старшына роты Рыбак пажыу у прымах вясковай дзяучынкI ЗосI, пакуль у яго мIнулася разгубленнасць ад пачатковых месяцау вайны.

На першы погляд можа здацца, што персанажы блIзкIя не толькI сваIм ваенным лёсам, але I маральна-этычнымI, IдэйнымI поглядамI. На справе ж – якIя гэта розныя, непадобныя людзI! СотнIкау, Рыбак персанажы-антыподы, сапраудная сутнасць якIх выяуляецца у час, калI пад смяртэльную пагрозу ставIцца Iх асабIстае жыццё, калI яны застаюцца сам-насам з ворагам, здаюць жорсткI экзамен на трываласць сваIх пераконнаняу. I як фотаплёнка, прапушчаная праз павелIчальнIк, набывае выразнасць I акрэсленасць, так СотнIкау I Рыбак, пастауленыя згодна жыццёвай праудзе у драматычнае становIшча, выяуляюць сваю сапраудную чалавечую сутнасць. Гэта надзвычай характэрная асаблIвасць мастацкай IндывIдуальнасцI В.Быкава – ставIць сваIх герояу у драматычныя сIтуацыI, "праяуляць" Iх духоуныя якасцI жорсткIмI выпрабаваннямI. СотнIкау I Рыбак паказаны у аповесцI выразна, з глыбокIм пранIкненнем у Iх унутраны свет, з фIксацыяй тонкIх нюансау Iх духоунага жыцця.

В.Быкау уважлIвы у высвятленнI героIкI I сацыяльных прадпасылак мужнасцI I патрыятызму савецкIх людзей.Асэнсоуваючы складаныя фIласофскIя I маральна-этычныя праблемы, якIя асаблIва востра успрымаюцца героямI аповесцI менавIта таму, што Iм даводзIцца штодзённа судакранацца са смерцю, пIсьменнIк вылучае праблему сэнсу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыцця чалавека, яго адказнасці перад народам і гісторыяй. Гэта складанае пытанне, якое суадносіцца з філасофскімі катэгорыямі свабоды і неабходнасці, звязана перш за усё з вобразамі Сотнікава і Рыбака. Праз гэтыя вобразы выяуляецца грамадзянская і эстэтычная пазіцыя пісьменніка.

Само непадабенства лёсау і характарау Сотнікава і Рыбака падкрэслівае аднароднасць і паслядоунасць інтарэсау і схільнасцей аутара, які даражыць людзьмі, здольнымі на подзвіг, славіць высокую мужнасць чалавека. Ён паэтызуе мужнасць і стойкасць абаронцау Радзімы, вылучае на першы план пачуццё абавязку, які кіруецца яго герой у сваіх учынках. Прычым выкананне абавязку стала для Сотнікава натуральнай з'явай, арганічнай унутранай неабходнасцю. У складанай абстаноуцы горкага адступлення, не зважаючы на смяротную небяспеку, ён разам з байцамі сваёй батарэі адбівае націск варожых танкау. Пасля разгрому сваёй часці Сотнікау ідзе на усход і вядзе яго, параненага і знясіленага, вера у неабходнасць барацьбы за свабоду сваёй зямлі, самаахвярная любоу да чалавека.

Грамадзянскасць, мужнасць, гераічная загартоука не на адзін пару, а на усё жыццё уласціва Сотнікаву. Таму і пры адступленні, і пры выхадзе з акружэння, трацячы баявых сяброу, ён не губляе галоунага - веры у канчатковую перамогу.

Самабытны характар Сотнікава выяуляецца з дастатковай поунатой, таму што пісьменнік бачыць яго сувязь з нарадзіушай яго глебай, за навакольным асяроддзем, у якім ён фарміравауся. Сувязь гэта выканана праз цікавыя рэтраспекцыі, хоць іншы раз яна толькі угадваецца. Жыццё яго бацькі, гераічны учынак палоннага савецкага афіцэра, які нажом забівае канваіра, даючы магчымасць выратавацца частцы ваеннапалонных, - з'яуляецца для Сотнікава прыкладам, што дапамагае яму пераносіць фізічныя і маральныя перагрузкі, пераадолець трагізм абставін. У пераадоленні драматычных і трагічных сітуацый выяуляецца сіла духу і веліч гэтага чалавека. Трагічны воблік Сотнікава не траціць сваёй велічы, бо ён адухоулены высокай мэтай, гуманістычным сэнсам барацьбы. Сотнікау не скарыуся перад абставінамі. У арміі і у партызанскім атрадзе, а затым і у варожым засценку выяуляецца цудоуная сіла гераізму і раней выхаваная патрыятычная гатоунасць да подзвігу, увесь духоуны патэнцыял гэтага чалавека. Вытрымліваючы жахлівыя катаванні, ён імкнецца ўратаваць іншых людзей. Нават з пятлёй на шыі, Сотнікау працягвае



РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ

бой з фашызмам, за смерцю, бітву з эгацэнтрычнай філасофіяй жыцця. На мяжы чалавечых магчымасцей, не падуладны страху, ён вырастае у фігуру гераічную, не пакутніка, а пераможцы, сваёй смерцю сцвярджаючы сілу і неуміручасць тых прынцыпау, з якімі жыу, змагауся, за якія мужна загінуу.

Дадатковы ідэйна-мастацкі эфект ствараецца тым, што Сотнікау і ля шыбеніцы робіць, здавалася б, немагчымае у яго становішчы – памірае "агітацыйна". І які шматзначны мастацкі сімвал увасоблен у сцэне пакарання, калі Сотнікау пераглядаецца з хлопчыкам у будзёнаусцы, што стаіць у натоупе! Можна не сумнявацца, што памяць аб героі хлопчык захавае на усё жыццё, што гэты момант стане адным з важнейшых этапау у фарміраванні яго характару. Вобраз Сотнікава даследаван аналітычна, "буным планам", з зоркай засяроджанасцю на сацыяльных пружынах унутранага свету героя.

Сотнікау – літаратурны герой. І тым не менш, калі чытаеш твор, не пакідае адчуванне рэальнасці, бо у ім выяуляецца глыбокая прауда пра чалавека і час. Верагоднасць, праудзівасць таго, што адбываецца у творы, дасягаецца глыбокім веданнем матэрыялу, псіхалогіі чалавека, шчырай інтанацыяй апавядання, стройнай кампазіцыяй. Усё гэта робіць вобраз Сотнікава не проста жыццёвым, а жывым.

Сотнікаву у творы супрацьпастаулены Рыбак, але яны не прамыя антыподы. Характар у В.Быкава выяуляецца не толькі у адносінах да нейкага аднаго героя. Раскрыццё характару і яго ацэнка знаходзіцца на перакрыжаванні узаемадачыненняу героя з іншымі персанажамі, на перакрыжаванні іх поглядау. У гэтых адносінах значную ідэйную нагрузку маюць вобразы Дзёмчыхі, Качана Пётра, яурэйскай дзяучынкі Басі, пры дапамозе якіх аутар больш выразна вяуляе сваю пазіцыю, асуджае філасофію кампрамісу і прыстасавальніцтва, што уласціва Рыбаку.

Рыбак мог лічыць сябе някепскім партызанам, калі адчуванне сяброускага локця, партызанская узаемавыручка дапамагалі пераадольваць цяжкасці. Трапіушы у рукі паліцаяу, Рыбак забывае на іншых, імкнецца выратавацца любой цаной. У выходзе сутыкнення двух прама процілеглых пачаткау – натуральнага жадання выжыць і волі да барацьбы – раскрываецца сутнасць характару Рыбака. Сэнс вялікай барацьбы з фашызмам уяуляецца яму найперш як змаганне за сваё уласнае жыццё. Лёс вялікай справы, барацьба за якую стаіць

у Рыбака на другІм плане, не увайшоу у яго асабІсты лёс, таксама, як абарона гІстарычнай справядлІвасцІ не стала для яго барацьбой за шчасце чалавека. ХІсткасць, нетрываласць жыццёвай пазІцыІ Рыбака вІдавочныя. Гэта урэшце рэшт І прыводзІць яго да здрады сваІм таварышам па зброІ, свайму партызанскаму абавязку. Вобраз Рыбака палемІчна накІраваны супраць аднаго са шматлІкІх мІфау таталІтарнай сІстэмы: ("Когда страна быть прикажет героем, у нас героем становится любой".) Не кожны Ім становІцца. СІла духу І волІ здольна вытрымаць выпрабаванне толькІ тады, калІ неабходнасць гераІчнага дзеяння становІцца для чалавека маральнай патрэбнасцю, калІ гатоунасць да самаахвяравання абумоулена праяуленнем І сцверджаннем чалавечай годнасцІ, свабоды выбару І унутранага багацця асобы. Якраз гэтага не хапае Рыбаку. Яму нестае духоунай загартоукІ, унутранай вытрымкІ, не хапае пачуцця таварыскасцІ. МенавІта таму страх за сябе забІу у Ім байца І нарадзІу баязлІуца І прыстасаванца, здраднІка нарэшце.

Ужо у час першага допыту у палІцыІ Рыбак, Імкнучыся пазбегнуць катаванняу, саступІу ворагу у чымсьцІ вельмІ важным, галоуным – у тым, што абяззброІла яго, зрабІла слабым І палахлІвым, што адразу прадвызначыла перамогу над Ім ворага. КІруемы Інстынктам самазахавання, ён спяшаецца прыстасавацца да новых абставІн, стараецца "падыграць" следчаму, гатовы адразу, без барацьбы пайсцІ на кампрамІс з Ім, паступІцца сваІмІ поглядамІ. У свядомасцІ Рыбака лІхаманкава пульсуе толькІ адна думка: уратавацца, выкруцІцца, негледзячы нІ на што, нават выдаушы базу партызанскага атрада, СотнІкава. Таму ён ужо не абараняе Дзёмчыху – мацІ малалетнІх дзяцей, збІраецца выдаць партызанскага сувязнога Качана Пётру, гатоу пайсцІ у палІцыю, мяркуючы ашукаць ворага. Праудa, нават самому сябе ён не хоча прызнацца, што робІць нядобра, хоць у глыбІнІ свядомасцІ адчувае, што матывы яго паводзІн – нячыстыя. Спадзеючыся пасля адплацІць ворагу, адпомсцІць яму "потым", калІ дыханне смерцІ не будзе такІм блІзкІм, такІм рэальным, Рыбак вядзе свайго былога баявога таварыша на пакаранне смерцю, становІцца саудзельнІкам у злачынстве. Яму не хочацца верыць, што ён апынууся у стане ворага, таму ён І шукае сябе апраудання: "...пры чым тут ён? ХІба гэта ён? СотнІкау сам узлез, сам скочыу з цурбана. Ён толькІ трымау. І то па загаду палІцыІ".

Рыбак стараецца перакласцІ вІну за сваё маральнае падзенне

на Iншых, на час, на абставIны. "А цяпер вось таму (СотнIкаву - А.М.) дык усё роуна у вяроуцы на браме, а яму як, жывому?.." I зайздросцIць I скардзIцца Рыбак. УспомнIм драму "НавальнIца" А.Астроускага. Так, прыкладна, стоячы на беразе ВолгI зайздросцIу некалI ЦIхон сваёй жонцы Кацярыне. У абодвух выпадках - стогны слабай натуры, пакорлIвасць жыццёвым абставIнам.

Раней Рыбак хацеу уцякаць з палIцыI нават са звязанымI рукамI. Пасля гIбелI СотнIкава рукI свабодныя, але уцякаць ужо няма куды. Малаверагодна, што ён уцячэ I зойме зноу сваё месца у радах народных мсцIуцау пасля усяго таго, што адбылося у палIцыI. Па-першае, Рыбак не перажыу глыбокага душэунага крызIсу, у яго няма бязлIтаснага асуджэння самога сябе - зарукI магчымага духоунага адраджэння. Па-другое, як растлумачыць, чым апраудае ён свой удзел у пакараннI СотнIкава? Зацелася жыць? Але не менш, чым Рыбак, хацеу жыць I СотнIкау, якI I загIнуу у Iмя жыцця.

З пункту гледжання СотнIкава (I чытача таксама) Рыбак у фIнале аповесцI несумненна стау здраднIкам. ГуманIстычны сэнс паводзIн I учынкау, урэшце, свядомасцI СотнIкава спалучаецца з агульначалавечымI маральнымI нормамI, аб'ядноуваецца з ImI, перш за усё з яго паслядоуным Iмкненнем служыць Iдэалам справядлIвасцI, дабру блIжняга. А як жа Рыбак?

ГуманIстычная традыцыя, як вядома, сцвярджае, што асоба павIнна не толькI паважаць Iнтарэсы грамадства, няхай будзе то дзяржава, народ (у нашым канкрэтным выпадку тыя ж Дзёмчыха, Пётра, Бася), але I быць гатовай, калI спатрэбIцца, пайсцI на самаахвяраванне дзеля карысцI грамадства, дзеля чалавека. Але для Рыбака, для яго свядомасцI усяго гэтага проста не Iснуе, засланяецца яго эгаIстычным Iнтарэсам. Праудa, гэты "эгаIстычны Iнтарэс", стаука у яго змаганнI з пачварным злом вельмI высокая: уласнае жыццё партызана. Вось чаму, трапIушы у бяду, Рыбак не вытрымлIвае "блIжняга бою". I нейкIм апрауданнем для Рыбака могуць быць хIба толькI тыя нялюдскIя абставIны, што прыгатавала яму жорсткае ваеннае жыццё, таталIтарная сIстэма, прайсцI праз жахI якой I не зламацца, застацца чалавекам, трэба было быць сапрауды героем. Рыбак жа аказауся проста чалавекам, I у гэтым яго трагедыя. Трагедыя не толькI яго аднаго: як паказала таталIтарная сталIнская I гIтлераўская сIстэма, трагедыя многIх дзесяткау тысяч звычайных людзей.

Сапраудная гуманIстычная прауда твора заключаецца у тым, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рыбак хоць I застаецца жыць, але злачынная сIстэма прыводзIць яго да маральнага краху, да разбурэння яго асабовасцI. I гэта добра паказау В.Быкау у сваIм творы.

Аповесць "АбелIск" шмат у чым пераклIкаецца з аповесцю "СотнIкау", з'уляецца своеасаблIвым працягам яго праблематыкI. Аднак сIтуацыI, характары, праблемы, пастауленыя аутарам, асэнсаваны тут па-Iншаму, злIты з новымI канфлIктамI. I з гэтых пазIцый можна гаварыць пра новыя мастацкIя адкрыццI пIсьменнIка.

У аповесцI "АбелIск" адчуваецца спроба В.Быкава расшыраць дыяпазон сваёй прозы, увесцI у яе сучаснае жыццё, Iмкненне паказаць сувязь часоу, перакIнуць мост памIж мIнулым I сённяшнIм, каб у бурным, вIрлIвым часе не знIклI, не згубIлIся неабходныя нам маральна-этычныя каштоунасцI. З уласцIвай яму палемIчнасцю, В.Быкау даследуе усё новыя I новыя жыццёвыя абставIны, Iмкнецца пранIкнуць у сутнасць складаных жыццёвых эпIзодау, у логIку няпростага чалавечага лёсу. Апавяданне у творы вядзецца ад першай асобы. Адначасова з'уляючыся удзельнIкам падзей, слухачом I суддзёй, аутар малюе дарагIх яму героеу, якIя хоць загIнулI, але у той жа час жывуць у памяцI людзей. Жыццёвыя гIсторыI галоуных героеу аповесцI Мароза I МIклашэвIча надзвычай выразныя I змястоуныя. Гэта у першую чаргу з імI суаднесена праблема служэння людзям, адказнасцI перад мIнулым I перад будучыняй, што пастулена у творы.

Дзеянне адбываецца вакол Мароза, якI, ратуючы сваIх выхаванцау, аддау сябе у рукI ворага I быу закатаваны разам з IмI. Хто такI Мароз – герой, цI чалавек, якI не зрабIу нIчога каштоунага для агульнай барацьбы з ворагам, як гэта лIчаць некаторыя дзейныя асобы твора, у прыватнасцI, загадчык районо Ксяндзоу?

На гэта пытанне у аповесцI дадзен недвухсэнсоуны адказ.

Мароз – наш сучаснIк I разам з тым жывая гIсторыя супярэчлIвага руху новага жыцця, характар драматычны I высокI. Па духу ён кроуны брат СотнIкава, увасабленне сапрауды высокамаральных чалавечых якасцей. Ён прайшоу нялёгкI шлях, быу адным з першых настаунIкау у вызваленай ад паноу Заходняй БеларусI, адным з першых пачынальнIкау I арганIзатарау новага жыцця. Свой важнейшы настаунIцкI абавязак Мароз бачыу у тым, каб выхоуваць у людзей пачуццё высокай чалавечай годнасцI, грамадзянскай смеласцI I прынцыповасцI, умець ацэньваць вышынI агульначалавечай I нацыянальнай культуры. Робячы сваю справу душэуна, з клапатлIвай любоую да чалавека, ён

заусёды прыходзIу на дапамогу, аказвауся побач у цяжкую хвIлIну. Не умеу Мароз адгароджвацца ад чужога болю, хавацца за Iнструкцыю нI у мIрны час, нI тым больш у пару ваеннага лIхалецця.

ПIсьменнIк не расказвае падрабязна бIяграфIю героя. Яна падаецца рэтраспектыуна, выступае у памяцI Ткачука асобнымI карцIнамI. I мы паступова становIмся сведкамI таго, як у мIрныя днI назапашвауся у характары Мароза той духоуны патэнцыял, што пераплавIуся пасля у мужнасць, сочым, як фармIравалася грамадзянскасць яго светапогляду. Усё даваеннае жыццё Мароза - гэта прэлюдыя да подзвIгу, якI ён здзяйсняе у Iмя чалавека, у Iмя жыцця. Усведамленне свайго грамадскага прызначэння нараджае у Мароза тую унутраную стойкасць I перакананасць, якая характарызуе сапраунднага чалавека.

Пасля прыходу фашыстау настаунIк не пакIнуу сваёй справы. Для яго праца у школе стала своеасаблIвым фронтам, формай барацьбы за розум I душы дзяцей, той сферай, дзе ён мог прынесцI найбольшую карысць. Гэта адчувае нават недальнабачны пракурор СIвак, калI гаворыць пра Мароза: "ЯкI з яго, кульгавага, партызан! Ён тут болей патрэбны". I сапрауды, Мароз шмат робIу, як партызанскI сувязны, падпольшчык. КалI ж фашысты узялI заложнIками вучняу Мароза, каб выкрыць хлуслIвую прапаганду ворага: "... во... як робяць Саветы: чужымI рукамI ваююць с немцамI, дзяцей на закланне ахвяруюць", - ён без дазволу камандзIра атрада Iдзе выручаць юнакоу.

Лепшыя IмкненнI душы гэтага чалавека, яго патрыятычная адданасць засталIся не зразумелымI тады, доуга няправIльна успрымалIся I пасля вайны. Па IнерцыI лIчылI, што Мароз "здауся" у палон. Аб гэтым нават пасля таго, як быу даказаны высокI гераIзм учынку Мароза гаворыць загадчык райана Ксяндзоу. Душэуны аутаматызм, слепата перашкаджаюцьКсяндзову зразумець тое, што зрабIу Мароз, адчуць сэрцам усю значнасць самаахвярнага жыцця гэтага чалавека, яго адзIнаборства са смерцю. Ксяндзоу не бярэ пад увагу тое, што Мароз не мог паступIць Iнакш, не мог спакойнасядзець у бяспечным месцы, ведаючы, што яго выхаванцы пакутуюць I чакаюць дапамогI. Ахоплены аднIм жаданнем - ратаваць дзяцей - Мароз Iдзе да немцау. Гэты учынак - не што Iншае як сцверджанне такой чалавечай духоунасцI, якая пазбаулена эгаIзму I меркаванняу мяшчанскага "здаровага сэнсу". Мароз выяуляе высокую меру гераIзму, не прадыктава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кую нІякІмІ пабочнымІ меркаваннямІ І разлІкамІ. Гэта мужнасць грамадзянскай сумленнасцІ І прынцыповасцІ, маральнай чысцІнІ, бескарыслІвасцІ І высокай чалавечай годнасцІ. ТакІ тып гераІчных паводзІн не менш цяжкІ, чым мужнасць ваенная. ГераІзму грамадзянскай сумленнасцІ, вернасцІ прынцыпам І перакананням, І урэшце рэшт вернасць народу, РадзІме - гэтага уладарна патрабавау час у мІнулым, гэта неабходна І сёння героям лІтаратуры І жыцця.

В.Быкау гаворыць у сваІм творы пра множнасць гераІчных здзяйсненняу савецкІх людзей, пра складанасць барацьбы, жыцця, якое не укладваецца у звыклую схему.

ГІсторыя барацьбы з фашызмам ведае безлІч прыкладау сапрауднага гераІзму, высокую мужнасць беларускага партызана бацькІ МІная І гераІчную, самаахвярную смерць польскага педагога Януша Корчака. Можна сказаць, што рэальны герой Айчыннай вайны партызанскІ камандзІр М.П.Шмыроу І лІтаратурны герой настаунІк Мароз стаяць у адным радзе героям, толькІ на розных яго канцах. Матывы паводзІн кожнага з Іх абумоулены Іх становІшчам у агульнанароднай барацьбе, любоую да чалавека, усведамленнем свайго абавязку перад краІнай І часам. Гэта сведчыць пра тое, што гераІчныя пачаткІ жыцця нІколІ не выяуляюцца адназначна.

В.Быкау паказау у аповесцІ "АбелІск", што тупая бесчалавечая сІла фашызму была зломлена народам, натхнёным высокІмІ ІдэаламІ сапраудной чалавечнасцІ І справядлІвасцІ.

ТакІм чынам, выяуленне духоунага патэнцыялу асобы у гады вайны у творах В.Быкава з'яуляецца важным момантам у выкрыццІ крывавай таталІтарнай дактрыны І яе дзяржаунай практыкІ нечуванага генацыду. Вызваленне асобы, яе духоуных І маральных багаццяу выявІлася у аповесцях В.Быкава гэтак жа моцна, як І абарона пІсьменнІкам жыццёвай І мастацкай прауды. У сваю чаргу давер да асобы І Імкненне да прауды, арыентацыя на агульначалавечыя маральныя І духоуныя каштоунасцІ дапамагалІ В.Быкаву заставацца на вышынІ задач, што ставІць перад сабой рэалІстычная лІтаратура.

С.В.Солодовников
(кафедра литературы)

## ДВА АСПЕКТА ОДНОЙ ПРОБЛЕМЫ

(пьесы К.Чапека "Средство Макропулоса" и К.Крапивы "Врата бессмертия")

Произведения литературы, в которых поднимаются проблемы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ